БАРАЦЬБІТ ЛЕНІНСКАЙ ЗАГАРТОЎКІ

Да 75-годдзя з дня нараджэння А. Р. Чарвякова

□ □ □

Вайна, быццам віхор, сарвала з наседжаных мясцін мільёны людзей. Чароды абозаў рухаліся з Беларусі ў глыбіню краіны. Усе паязды былі забіты бежанцамі. Каля трох мільёнаў жыхароў Беларусі сустрэлі Кастрычніцкую рэвалюцыю ў розных кутках Расіі. Асабліва шмат іх асела ў Петраградзе.

Для наладжвання рэвалюцыйнай работы сярод бежанцаў у Петраградзе партыя накіравала маладога камуніста А. Р. Чарвякова. Гэты выбар быў не выпадковы. Уся папярэдняя дзейнасць Аляксандра Рыгоравіча была накіравана на служэнне працоўнаму народу.

Нарадзіўся А. Р. Чарвякоў 8 сакавіка 1892 года ў вёсцы Дукорцы Дукорскай воласці Мінскай губерні. Скончыў спачатку прыхадскую школу, а затым—гарадское вучылішча і паспяхова вытрымаў экзамен на званне народнага настаўніка.

Будучы яшчэ ў гарадскім вучылішчы, Чарвякоў цвёрда вырашыў прысвяціць сваё жыццё служэнню працоўнаму народу. Настаўнік чым мог дапамагаў сялянам, прымаў удзел у рабоце таварыства «Веды», якое

Петраград у кулямётную школу. Тут яго і застала Лютаўская рэвалюцыя. У канцы красавіка пасля скончэння школы ён быў назначаны ў 2-гі кулямётны полк.

Кулямётная рота пад камандаваннем А. Р. Чарвякова

Петраградскім раённым камітэце ўзнікла Беларуская камуністычная секцыя.

У лютым 1918 года дэкрэтам за подпісам У. І. Леніна А. Р. Чарвякоў назначаецца на пасаду камісара па беларускіх справах пры СНК РСФСР. Беларускі нацыянальны камітэт правёў вялікую работу па падрыхтоўцы да ўтварэння БССР.

У далейшым А. Р. Чарвякоў па партыйнай мабілізацыі прызываецца ў Чырвоную Армію на пасаду камісара дывізіі.

Восенню 1918 года яго зацвярджаюць загадчыкам культурна-асветнага аддзела ва Усерасійскім бюро ваенных камісараў. Паралельна з гэтым ён вёў работу ў Беларускім камісарыяце і ў рэдакцыі газеты «Дзянніца».

У 1918 годзе як член Часовага ўрада Чарвякоў падпісаў Маніфест аб утварэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і быў назначаны Народным Камісарам асветы Беларусі.